Калі працуеш з вучнямі, якія мэтанакіраваны на павышаны ўзровень вывучэння прадмета, то патрэбен суадносны ўзровень прафесійнага майстэрства настаўніка. На пачатку навучальнага года ў Дзяржаўнай установе адукацыі “Акадэмія паслядыпломнай адукацыі” ***з 22 по 26 жніўня 2016 года*** адбылося павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў англійскай мовы **“Праектаванне педагагічнай дзейнасці настаўніка замежнай мовы з высокаматымаванымі вучнямі”.** Заняткі праводзіла **Зубрыліна Інэса Уладзіміраўна,** настаўніца англійскай мовы кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”.

Змест вучэбнай праграмы накіраваны на павышэнне якасці валодання педагогамі прадметнай і метадычнай падрыхтоўкай, якія працуюць з высокаматываванымі вучнямі ў профільных класах, а таксама рыхтуюць іх да ўдзелу ў алімпіядзе па замежнай мове.



Настаўнікам прапанавалася праектаваць асабістую дзейнасць у чатырох накірунках: “настаўнік – вучань”, “настаўнік – настаўнік”, “настаўнік – соцыум”, “самаадукацыя настаўніка”. Усе чатыры вектары закальцаваныя на адну і тую ж тэму – удасканаленне вучэбнай дзейнасці высокаматымаваных вучняў. А таму ў адукацыйным працэсе па замежнай мове патрабуюцца сучасныя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. На вучэбных занятках па англійскай мове прадугледжваецца выкарыстанне вучнямі мабільных тэлефонаў, з дапамогай якіх можна даволі цікава вучыцца.

Настаўнікі з вялікім задавальненнем вучыліся праектаваць вучэбныя заняткі па англійскай мове, спрабуючы ствараць самастойна дыдактычныя напрацоўкі адносна ўсіх чатырох вектараў. У час заліку ўдзельнікі павышэння кваліфікацыі абаранялі ўзоры створанага кожным на практычных занятках педагагічнага матэрыялу.